# Старонкі забытых успамінаў

Іван Антонаў, аўтар успамінаў пра 1919 і 1920 гг., быў гарадзенскім настаўнікам, з 1918 г. кіраўніком 3–кляснай беларускай школы, старшынём Настаўніцкай рады і чальцом Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту.

Пасьля заняцьця Горадні палякамі кароткі час польска–беларускія адносіны складваліся добра, але хутка польскія ўлады прыступілі да ліквідацыі беларускага нацыянальнага руху. Шматлікія беларускія дзеячы і афіцэры Беларускага палка былі арыштаваныя і першапачаткова пасаджаныя ў вязьніцу ў Беластоку, адкуль пасьля былі разасланыя ў розныя лягеры на тэрыторыі Польшчы.

І. Антонаў быў арыштаваны 18 ліпеня 1919 году і высланы ў лягер у Домбі пад Кракавам. Ад часу вызваленьня аўтара зь лягеру ў Домбі пачынаецца публікаваны тут фрагмэнт успамінаў[1]. Арыштаваны паўторна, Антонаў апынуўся ў лягеры ў Беластоку.

Гэты лягер, т. зв. “Стацыю Разьдзельчу” для палонных і інтэрнаваных, узятых на полі бою, польскія ўлады пачалі арганізоўваць 6 жніўня 1919 г. З гэтай мэтай была выкарыстаная значная частка памяшканьняў этапнага пункту Дзяржаўнай управы па справах вяртаньня палонных, бежанцаў і рабочых, створанай у канцы лютага 1919 г. на тэрыторыі былога расейскага Угліцкага палка, за 5 км ад чыгуначнай станцыі.

“Стацыя Разьдзельча” ў Беластоку падпарадкоўвалася Міністэрству вайсковых спраў. Найбольш людзей (1168) на ёй знаходзілася ў сьнежні 1919 г.

Хутка пасьля адкрыцьця станцыі пачаліся эпідэміі заразных хваробаў: тыфу і дызэнтэрыі, у сувязі з чым яна два разы зачынялася. У выніку эпідэміяў у Беластоку памерлі некалькі сотняў палонных і інтэрнаваных. Сытуацыю, якая прывяла да такой высокай сьмяротнасьці, менавіта і апісвае І. Антонаў, які знаходзіўся ў Беластоку ў самы цяжкі час. Сьведчаньне Антонава знаходзіць пацьверджаньне ў афіцыйным рапарце падпалкоўніка Хабішта, які інспэктаваў станцыю ў лістападзе 1919 г.:

> […] У лягеры на кожным кроку бруд, неахайнасьць, занядбанасьць і людзкая галеча, якая зьвяртаецца да неба з просьбай аб помсьце. […] Баракі ўсе перапоўненыя, сярод “здаровых” шмат хворых. На маю думку, сярод гэтых 1400 палонных няма па–сапраўднаму здаровых людзей. Пакрытыя лахманамі, яны туляцца адзін да аднаго і грэюцца. […] Два баракі абсталяваныя як шпіталь, прытым старанна, відаць жаданьне выпраўленьня кепскай сытуацыі, але, на жаль, за гэта ўзяліся позна, не хапае сродкаў і людзей, каб сёньня зрабіць тую працу, зь якой трэба было справіцца за месяц перад гэтым. Не хапае коўдраў, таму хворыя прыкрытыя папяровымі сеньнікамі. Афіцэр, высланы па коўдры ў Варшаву, яшчэ не вярнуўся. Не хапае паліва і дыетычнага харчаваньня. Немагчымае любое лячэньне. Амэрыканскі Чырвоны Крыж даў трохі прадуктаў, рысу, але калі гэта скончыцца, то хворых ня будзе чым карміць. Дзьве ангельскія санітаркі зачыніліся ў адным бараку, даглядаюць хворых на дызэнтэрыю, іхная ахвярнасьць выклікае зьдзіўленьне. Сярод шасьці польскіх санітарак ёсьць адна, якая перахварэла на тыф. Для іх няма ні памяшканьняў, ні адпаведных спальных месцаў […][2].

Зробленыя па выніках інспэкцыі захады (пры дапамозе Амэрыканскага Чырвонага

[1] Антонаў І. Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны ў 1919–1921 гг. Малюнкі гвалту і зьдзеку фацэтных польскіх паноў на Беларусі (мае перажываньні). Коўна, 1921.

[2] Гл.: Karpus Z. Jeńcy internowani w Białymstoku i Brześciu Litewskim w latach 1919–1920 // Zeszyt Naukowy Muzeum Wojska Polskiego (Białystok). 1992. № 6.

Крыжа, які дастаўляў прадукты і адзеньне) дапамаглі справіцца з эпідэміяй. Падчас бальшавіцкага наступленьня летам 1920 г. станцыя была эвакуяваная ў Памяхувак пад Модлінам, дзе і была ліквідаваная.

У Беластоку "Стацыя Разьдзельча" аднавіла працу 23 лістапада 1920 г. Да сярэдзіны лютага 1921 г. на станцыі знаходзіліся бальшавіцкія палонныя, пасьля гэтага ў Беласток накіроўваліся таксама інтэрнаваныя жаўнеры зь беларускіх частак, якія змагаліся на польскім баку — войскаў генэрала Булак–Балаховіча і Слуцкай брыгады.

У якасьці т. зв. канцэнтрацыйнага лягеру № 21 станцыя функцыянавала да 15 кастрычніка 1921 г. Інтэрнаваныя беларускія жаўнеры, колькасьцю 777 чалавек, былі адасланыя ў іншыя лягеры.

Мы сёньня прыгадваем пра "Стацыю Разьдзельчу" ў Беластоку не для таго, каб шукаць вінаватых ці вярэдзіць раны. Мы павінныя аддаць належнае яе ахвярам. Празь беластоцкі лягер прайшлі, акрамя савецкіх палонных, большасьць дзеячоў Беларускай Народнай Рэспублікі з тэрыторыі Гарадзеншчыны (разам зь Беласточчынай), пачынаючы ад чальцоў Беларускага нацыянальнага камітэту, працягваючы настаўнікамі беларускіх школаў і скончваючы простымі сялянамі. Сюды ў 1919 г. патрапілі афіцэры гарадзенскага Беларускага палка, а годам пазьней — жаўнеры Булак–Балаховіча і Слуцкай брыгады, якая да канца сьнежня 1920 г. супрацоўлялася Чырвонай Арміі пры абароне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Сотні людзей, якія сядзелі ў беластоцкім лягеры, памерлі, а іхныя целы былі пахаваныя не па–хрысьціянску. Пра гэтых людзей мы павінныя памятаць і маліцца за іх.

Мы павінныя адшукаць месца іхнага спачываньня і пазначыць яго, згодна зь беларускім звычаем, крыжам сьвятой Эўфрасіньні Полацкай.

*Перакладзена з польскай мовы паводле публікацыі ў:*
Czasopis. 1993. № 2. S. 2.